# Шчаслівая моладзь совецкай краіны

Яшчэ задоўга да пачатку сходу светлыя пакоі Акруговага Дома афіцэраў запоўніла моладзь. Усюды чуваць жыццерадасныя галасы юнакоў і дзяўчат, прышоўшых сюды, каб пагутарыць аб сваіх справах, выказаць думкі і пачуцці, якія хвалююць кожнага з іх. І сапраўды, пачуцці поўняць сэрца кожнага юнака і дзяўчыны: 10 лютага 1946 года кожны з іх прыдзе да выбарчых урнаў, каб выканаць свой грамадзянскі абавязак — прагаласаваць за лепшых сыноў народа, бязмежна адданых справе Леніна—Сталіна.

Вось ідзе Герой Совецкага Саюза старшына Віктар Еронька. Яго ўзнагароды — сведкі жорсткіх бітваў, у якіх совецкі воін заўсёды атрымліваў перамогу. Па залу праходзіць група студэнтаў —удзельнікаў партызанскага руху ў Беларусі. На іх грудзях—скромныя медалі «Партызану Айчыннай вайны». У ляроўных бітвах з ворагам яны адстайвалі заваёвы самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі, адстайвалі сваё шчасце, якое ў дні Вялікага Кастрычніка здабылі ў баях бацькі і старэйшыя браты.

Сакратар гаркома комсамола тав. Барашка адкрывае сход маладых выбаршчыкаў. Ён прадастаўляе слова Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР тав. Наталевічу.

З вялікай увагай слухае моладзь расказ тав. Наталевіча аб тых вялікіх правах, якія прадаставіла Сталінская Канстытуцыя совецкай моладзі, аб задачах, якія стаяць цяпер перад народам у аднаўленні народнай гаспадаркі, разбуранай фашысцкімі захопнікамі.

**Сустрэча маладых выбаршчыкаў Мінска з Старшынёй Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР тав. Н. Я. НАТАЛЕВІЧАМ**

Тав. Наталевіч на канкрэтных прыкладах паказвае, як наша моладзь выкарыстоўвае свае правы, як яна змагалася за іх.

— Нямецкай моладзі, — гаворыць тав. Наталевіч, — выпускаючы яе з школы, давалі нож і казалі: «ідзі забівай, забівай усіх, не шкадуючы ні малога, ні старога». Наша школа ўзбройвае маладога чалавека самымі перадавымі ведамі і праводзіць яго ў жыццё словамі: «ідзі, твары, будуй, каб людзям жылося яшчэ лепш, каб яны не ведалі гора і пакут».

— Наша моладзь, — гаворыць далей тав. Наталевіч, — акружана клопатамі совецкай улады і большэвіцкай партыі. Яна добра ведае, што ў большэвіцкай партыі няма другіх інтарэсаў, апрача інтарэсаў свайго народа. Вось чаму народ любіць нашу партыю і ў дзень прадстаячых выбараў аддасць галасы за яе лепшых сыноў і дачок.

Слова бярэ капітан ордэнаносец тав. Караблёў. Ён гаворыць:

А. АСІПЕНКА.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы